А. А. ЯНОЎСКІ

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ: АД ІДЭІ ДА ЎВАСАБЛЕННЯ

Гісторыя універсітэцкай адукацыі зыходзіць з глыбінь сярэднявечча. Узнікненне ў еўрапейскіх краінах у XII—XIII ст. імкнення да ведаў было абуджана новымі абставінамі, той роллю, якую пачалі адыгрываць у жыццядзейнасці грамадства гарады, дзелавая актыўнасць бюргерства, назапашванне і ўменне рэалізоўваць тэарэтычныя і практычныя веды. Характэрна, што на працягу далейшага развіцця еўрапейскага грамадства роля універсітэта як своеасаблівай карпарацыі інтэлектуалаў пастаянна ўзрастала, ахоплівала ўсё новыя і новыя сферы яго дзейнасці, станавілася як бы індыкатарам цывілізаванасці, магчымасці не толькі адлюстроўваць узровень сучасных патрабаванняў, але і пракладваць шляхі ў будучае.

На вялікі жаль, да гэтага часу далёка не ўсе з неабходнай павагай успрымаюць вялікую місію, якую выконваў універсітэт у мінулым і якую ён з яшчэ большым грамадскім значэннем выконвае цяпер. Нездарма адзін з глыбокіх даследчыкаў сярэднявечча, французскі гісторык Жак Ле Гофф адзначыў, што недаацэнена навізна універсітэцкай дзейнасці як шляху «... интеллектуального и общественного выдвижения» [1, *11*]. Больш за тое, на ўсім працягу свайго існавання універсітэты развіваліся не толькі і не столькі як грамадскія ці дзяржаўныя інстытуты, а менавіта як вынік і адначасова форма праяўлення гуманістычных памкненняў у грамадстве. У першую чаргу гэта рэалізавалася праз тыя магчымасці, якія даваў універсітэт для праяўлення талентаў і здольнасцей сваіх выкладчыкаў і студэнтаў. Не другараднае месца займала і форма, з дапамогай якой яны ўдасканальваліся і знаходзілі ўвасабленне ў высокапрафесійнай інтэлектуальнай працы: універсітэцкая аўтаномія, універсітэцкія свабоды, панаванне розуму і ведаў. Усё гэта з'яўлялася і з'яўляецца адметнымі рысамі універсітэцкай сутнасці.

У гэтай сувязі міжволі згадваюцца рэтраспекцыі, гістарычныя параўнанні. У далёкім 1347 г. папскай булай былі прадастаўлены Пражскай генеральнай школе універсітэцкія прывілеі, каб «на вечные времена процветал университет, ... чтобы учителя и студенты там радостно пользовались всеми правами, льготами и изъятием из общей юрисдикции...» [2, *58*]. Праз стагоддзі ў статуце Беларускага дзяржаўнага універсітэта льготы, дэталёва прапісаныя на некалькіх старонках, абгрунтавалі яго «образовательную, интеллектуальную и социальную миссию...» [3, *5*].

Такім чынам, узнікненне і развіццё універсітэтаў непасрэдна звязана з гісторыяй грамадства, той ці іншай краіны на этапе высокага ўзроўню цывілізаванасці. Больш за тое, універсітэт і ўвасабляе гэты ўзровень. Вось чаму, каб быць дасведчаным у са-

мых розных накірунках культурнага, сацыяльнага, палітычнага жыцця, нельга абысціся без ведання гісторыі універсітэцкай дзейнасці. Таму для беларускай навукі ў апошні час усё больш прывабнай і актуальнай становіцца гэтая тэма. У першую чаргу гэта гісторыя Белдзяржуніверсітэта, якая, зразумела, мае сваю прадгісторыю.

На працягу амаль двух стагоддзяў на абшарах Расійскай імперыі марудна, але няўхільна ўсталёўвалася сістэма вышэйшай школы. І Беларусь, пасля ўключэння яе ў склад імперыі, аказалася ў сферы ўздзеяння гэтай сістэмы. Але так званы «Паўночна-Заходні край», насельніцтва «новадалучаных тэрыторый» доўгі час не выклікалі даверу царскага ўрада, які добра разумеў моц уздзеяння адукацыі вышэйшага ўзроўню не толькі на розум, здольнасці маладых людзей, але, у першую чаргу, на ўнутраны свет чалавека. Менавіта універсітэцкая адукацыя распрыгоньвала гэты свет, рабіла студэнтаў як спецыялістамі-інтэлектуаламі, так і свабоднымі ў дзеяннях людзьмі, а перш-наперш — людзьмі, якія імкнуцца да свабоды, не прымаюць насілля над сабой у аніякіх формах, гатовы весці барацьбу за сваю (і не толькі сваю) свабоду.

Вось чаму на Беларусі ні ў XIX ст., ні ў пачатку XX ст. так і не быў створаны універсітэт, вакол якога натуральна магла б скласціся універсітэцкая прастора з усімі яе адукацыйнымі, культурнымі, гуманістычнымі характарыстыкамі. А гэта была б новая з'ява ў традыцыйна архаічнай сістэме расійскай паўсядзённасці. Існаванне новай сацыяльнай рэчаіснасці, больш за тое — новай саслоўнай групоўкі на і так дастаткова неспакойных тэрыторыях магло прывесці да непрадказальных наступстваў.

Універсітэцкія карпарацыі Вільні і Варшавы таму былі прыкладам. І не дзіўна, што знакаміты на ўсю Еўропу Віленскі універсітэт у 1831 г. ва ўмовах падаўлення паўстання на беларускіх землях быў зачынены. Варшаўскі ж універсітэт, да якога імкнулася моладзь з Беларусі, таксама быў зачынены, праўда, затым указам Аляксандра II ад 8 чэрвеня 1869 г. ён быў узноўлены, але набыў статус «імператарскага», «рускага», а значыць — асабліва кантралюемага на прадмет лаяльнасці да ўлады [4, *607*].

Знішчэнне адукацыйнай аўтаноміі на беларускіх землях, якая існавала ў межах Расійскай імперыі з часоў падзелу Рэчы Паспалітай і якую перш за ўсе ўвасаблялі універсітэты, прывяло да таго, што асноўнымі цэнтрамі вышэйшай адукацыі для моладзі з Беларусі сталі універсітэты Масквы, Пецярбурга, Кіева [5, *10*].

Такое становішча ўжо ў хуткім часе аказала свой негатыўны ўплыў на развіццё культурнага асяроддзя, у якім ішло станаўленне беларускага грамадства. Нездарма амаль праз 100 гадоў першы рэктар БДУ Уладзімір Іванавіч Пічэта, адзначаючы гэты факт, зробіць выснову, што адсутнасць універсітэта на Беларусі прывядзе яе ў другой палове XIX — пачатку XX ст. да стану ўсімі забытай і пакінутай краіны [6, *3—19*].

Тым не менш, новы час настойліва запатрабаваў людзей адукаваных, спецыялістаў новага ўзроўню ведаў, новай ментальнасці. Таму напрыканцы XIX ст. расійскі ўрад вымушаны быў усё часцей звяртацца да пытанняў асветы, навукі, абмяркоўваць планы стварэння новых навучальных устаноў, у тым ліку універсітэтаў. Да гэтага ўрад падштурхоўвалі звароты з месцаў, ад губернскіх і гарадскіх улад. Так, пад уплывам ліберальных настрояў 60-х гг., калі сталі пакрыху разблытвацца путы прыгонніцтва, віцебскае дваранства ўзняло пытанне аб неабходнасці адкрыцця універсітэта ў беларускіх губернях. Але нават зварот да цара з боку міністра адукацыі на гэты конт застаўся без увагі. І ў пачатку XX ст. станоўча вырашыць набалелае пытанне не ўдалося, хаця мясцовыя ўлады рашуча запэўнівалі, што універсітэт з'явіцца «прочным оплотом русского начала против иноплеменного влияния» [7, *89—90*]. Між тым у беларускім

грамадстве добра ўсведамлялі высакародную місію універсітэта як цэнтра не толькі спецыяльнай адукацыі, але перш-наперш агульнай, дасягненне якой якраз і павінна ісці праз адукацыю спецыяльную [8].

Царскія ўлады пабаяліся пайсці на стварэнне універсітэта ў «Паўночна-Заходнім краі» перш за ўсё з-за магчымасці разбудзіць тут праз студэнтаў, іх адукаванасць і павышаную грамадскую актыўнасць, заглушаныя рэцэдывы нацыянальна-палітычнай барацьбы. Да гэтай высновы прыйшла ў 1906—1907 гг. спецыяльная камісія Міністэрства асветы. Спробы з боку ўлад Смаленска, Мінска, Віцебска пераканаць царскі ўрад у адваротным, у тым, што універсітэт стане «могучим рассадником русской культуры на Белоруссию…», не далі вынікаў [7, *97*, *15*].

І толькі рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. у каторы раз узрушылі набалелае пытанне, хаця Часовы ўрад А. Керанскага змог толькі закрануць яго. Першыя рэальныя крокі да стварэння беларускага універсітэта зрабіў урад (Народны сакратарыят) Беларускай Народнай Рэспублікі, заявіўшы аб сабе ў сакавіку 1918 г. Над універсітэцкім праектам сталі працаваць вядомыя беларускія вучоныя-гуманітарыі, атрымаўшыя адукацыю і сфарміраваўшыяся як вучоныя ў Маскве і Пецярбургу. Першасная роля належала гісторыку Мітрафану Віктаравічу Доўнар-Запольскаму і філолагу і этнографу Яўхіму Фёдаравічу Карскаму. Вядома, што Яўхім Фёдаравіч падчас свайго выступлення на Усебеларускім кангрэсе ў снежні 1917 г. акцэнтаваў увагу прадстаўнікоў розных колаў беларускага грамадства, узрушаных рэвалюцыйнымі падзеямі, на неабходнасці хутчэйшага стварэння на Беларусі свайго нацыянальнага універсітэта. Яго праект статута Беларускага універсітэта ў хуткім часе быў надрукаваны ў газеце «Вольная Беларусь» [9, *79*]. Аднак ва ўмовах, калі Беларусь была акупіравана кайзераўскай Германіяй і калі ўрад БНР не быў успрыняты бальшавікамі, разлікі на рэалізацыю універсітэцкіх планаў зноў сталі эфемернымі. Не мог быць рэалізаваны і план бальшавікоў аб замацаванні ў 1918 г. за Беларуссю Юр'еўскага універсітэта і пераводзе яго ў адзін з незанятых немцамі гарадоў — Віцебск ці Смаленск. Намаганнямі Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Маскве быў створаны як бы правобраз класічнага універсітэта — Беларускі народны універсітэт. Але гэта быў не сапраўдны універсітэт... І не на Беларусі.

Тым не менш першапачатковая падрыхтоўчая работа, у тым ліку праведзеная і ўрадам БНР, не магла застацца без наступстваў. Рэвалюцыйная віхура, якая вынесла да ўлады менавіта бальшавікоў і Саветы, прадыктавала неабходнасць улічваць пры распараджэнні ўладай імкненне народаў былой Расійскай імперыі да рэалізацыі сваіх нацыянальных задач, захавання і ўзбагачэння нацыянальных асаблівасцей. Гэтаму ў поўнай меры адпавядала дзейнасць універсітэтаў з іх своеасаблівай адукацыйнай і агульнакультурнай прасторай, з іх велізарнымі магчымасцямі ўздзеяння літаральна на ўсе сферы сацыяльнага жыцця, палітыку, светапогляд і інш. Існавала толькі неабходнасць утрымаць працэс стварэння і дзейнасці універсітэтаў пад знакам агульных і асаблівых установак, дыктуемых з цэнтра, з Масквы.

Таму зразумела, што адной з першых пастаноў ЦВК Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь стаў дэкрэт 25 лютага 1919 г., якім вызначаліся канкрэтныя меры па стварэнню ў Мінску універсітэта. Для ўзгаднення арганізацыйных пытанняў у Маскву выехаў старшыня ЦВК ССРБ А. Ф. Мяснікоў, які абгрунтаваў правамернасць лютаўскага дэкрэта «соображениями экономического, технического и культурно-бытового характера» [10, *30*, *9*]. Былі выдзелены грошы (1 млн рублёў), створана

спецыяльная камісія пры губернскім камісарыяце народнай асветы пад кіраўніцтвам Я. Карскага [11]. У яе склад увайшлі Чарвякоў, Іваноўскі, Марэк, Андэрсан, Маслоўскі, Камінскі, Фрумкіна і інш. Літаральна за 2 месяцы камісія арганізавала падрыхтоўчыя курсы для жадаючых паступаць ва універсітэт. На іх сярод іншых выкладчыкаў заняткі вёў і Я. Карскі.

Аднак справу стварэння беларускага універсітэта з-за абставін, як можна цяпер усвядоміць, перш за ўсе палітычнага кшталту, цэнтральныя органы ўлады палічылі за лепшае трымаць пад непасрэдным кантролем. Таму пры Народным камісарыяце асветы РСФСР была ўтворана яшчэ і маскоўская камісія.

Адна з галоўных задач, якая павінна была быць вырашана станоўча і перш за ўсе астатнія, — гэта знайсці ў разбураным рэвалюцыйнымі падзеямі, а потым і польскай акупацыяй Мінску больш-менш прымальныя для вядзення вучэбных заняткаў будынкі і памяшканні. Іх трэба было адшукаць, прыладзіць да універсітэцкіх патрэб. З пункту гледжання юрыдычных акалічнасцей перашкод для савецкіх улад не было — усе іх дзеянні абгрунтоўваліся задачамі будаўніцтва новага грамадства і выхоўвання для яго людзей новага гарту. Таму патрэбныя будынкі проста перадаваліся універсітэту.

Так, ужо 10 сакавіка 1919 г. на пасяджэнні мінскай камісіі па арганізацыі БДУ было разгледжана пытанне аб перадачы універсітэту будынка былога камерцыйнага вучылішча, у якім размяшчаліся ваенныя курсы Заходняй дывізіі. У хуткім часе пад плануемы універсітэт адвялі памяшканне былой мужчынскай гімназіі на вуглу вуліц Губернатарскай і Падгорнай, будынкі духоўнай семінарыі на Аляксандраўскай вуліцы, былога жаночага духоўнага вучылішча на рагу вуліц Шырокай і Міхайлаўскай, былога ваеннага шпіталя, губернскай земскай бальніцы, рэальнага вучылішча Хайкіна, гімназіі Фальковіча і інш. [12].

Але толькі ў 1921 г. спецыяльнай пастановай Прэзідыума ЦВК ССРБ ад 18 красавіка быў афіцыйна зацверджаны спіс будынкаў, якія пераходзілі для патрэб БДУ. Адзначым, што адначасова універсітэт атрымаў у сваё распараджэнне прылеглыя да гэтых будынкаў землі, інвентар і г. д. Усе арганізацыі, якія там размяшчаліся, павінны былі да 1 ліпеня з'ехаць і перадаць універсітэту свае плошчы. Акрамя раней пералічаных будынкаў, у спіс былі ўключаны памяшканні фабрыкі «Вікторыя», яўрэйскай бальніцы, Рускага сходу, гаспадарка «Лошыца» з фальваркамі «Зацішша», «Дуброва», «Прылукі», лясная дача Ваньковіча [16, *114—116*].

Асобнае месца ў гэтым дастаткова доўгім пераліку займаюць будынкі гімназіі Фальковіча і вучылішча Хайкіна. Менавіта тут размясцілася першае праўленне БДУ, тут распачаліся першыя лекцыі, адчыніліся дзверы універсітэцкай бібліятэкі.

У гісторыю універсітэта будынак былой гімназіі Фальковіча ўвайшоў як «Першы дом БДУ», бо ў ім працаваў рэктар, дзейнічала бібліятэка і канцылярыя, вяліся заняткі на рабочым факультэце. Гэты будынак стаяў на рагу вуліц Магазіннай і Кашарнай. У 1863 г. яго пабудаваў для сваёй сям'і купец Сакер [14, а. 116 адв.]. З гадамі мяняліся ўладальнікі гэтага неардынарнага па сваёй архітэктуры невысокага дома. Мяняліся і назвы вуліц, на якіх ён стаяў: Кашарная стала называцца Батальённай, потым — Скобелеўскай, пры савецкай уладзе — Чырвонаармейскай. Магазінная вуліца (і гэта знамянальна) з 1922 г. атрымала назву Універсітэцкай, бо на ёй стаялі галоўныя будынкі БДУ: «Дом № 1» — былая гімназія Фальковіча, «Дом № 2» — былая фабрыка «Вікторыя», «Дом № 3» — былое вучылішча Хайкіна [20, *206*].

У 1906—1920 гг. дом купца Сакера прытуліў у сваіх сценах прыватную гімназію з правамі дзяржаўнай, арганізатарамі і фактычнымі гаспадарамі якой былі К. Фальковіч і С. Зубакін [25, *220, 221*; 26, а. *54, 55*]. Цікава, што Фальковіч пасля канфіскацыі яго маёмасці для патрэб БДУ пэўны час не пакідаў сцен сваёй, цяпер ужо былой, гімназіі. Ен быў прыняты на працу ва універсітэт выкладчыкам рабфака, выкладаў хімію і нават праславіўся як здатны на ўсе рукі чалавек, бо сам рабіў мэблю і абсталяванне для лабараторыі аналітычнай хіміі. Мабыць, за гэта праўленне універсітэта ў 1924 г. вынесла рашэнне выдаць «гражданину Фальковичу», былому гаспадару «Дома № 1 БДУ», частку яго маёмасці — рэчы хатняга ўжытку, якія для БДУ так і не спатрэбіліся. Такім чынам, руплівасць былога гаспадара, былога калежскага саветніка на ніве універсітэцкай адукацыі была хоць неяк адзначана [15, а. *102*].

Будынак рэальнага вучылішча, які да рэвалюцыі належаў (як і само прыватнае вучылішча) Э. Хайкіну, адметны тым, што ў яго аўдыторыях распачаліся першыя заняткі: якраз тут 31 кастрычніка прафесар-гісторык Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю студэнтам факультэта грамадскіх навук. Гэты будынак па вуліцы Магазіннай (затым — Універсітэцкай) стаў месцам, дзе нарадзіўся універсітэт.

Такім чынам быў пакладзены пачатак універсітэцкай адукацыі на Беларусі. Эмануіл Маісеевіч Хайкін, гаспадар аднаго з першых будынкаў БДУ, і гаспадар згаданай вышэй гімназіі Канстанцін Восіпавіч Фальковіч воляй лёсу назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю Белдзяржуніверсітэта. Наперадзе будуць не менш цяжкія гады, будзе імкненне да зменаў і ў матэрыяльным становішчы, і ў творчых здабытках, але першапачатковае становішча, першыя крокі да сваёй, універсітэцкага кшталту, сталасці, якасці заўсёды будуць выклікаць цеплыню і павагу ў нашчадкаў, у цяперашняй і будучай садружнасці, імя якой — БДУ!

Але вернемся да разгляду падрыхтоўчай працы па стварэнню беларускага універсітэта.

Абедзве камісіі (мінская і маскоўская) на працягу вясны 1919 г. распрацоўвалі вучэбныя планы, падбіралі навукова-педагагічныя кадры, абмяркоўвалі структуру будучага універсітэта. Без сумесных, актыўных і настойлівых дзеянняў вырашыць мноства вялікіх і малых пытанняў было немагчыма. Таму члены камісіі, а гэта былі вядомыя навукоўцы, педагогі, адразу адхілілі ўбок палітычныя матывы, і праца разгарнулася ў канструктыўным, творчым накірунку.

Аднак акупацыя Беларусі польскімі войскамі летам 1919 г. перарвала гэтую дзейнасць. Фармальна камісіі працягвалі існаваць, але рэальных дзеянняў у абставінах вайны і агульнай няўпэўненасці, развалу, галечы яны не маглі ажыццяўляць. Як не дзіўна, але найбольш інертнай аказалася маскоўская камісія, якая фактычна распалася. Мінская ж, апынуўшыся на акупіраванай палякамі тэрыторыі, захавала свае рады. Яе члены нават зрабілі спробу адкрыць у Мінску «Вышэйшыя курсы універсітэцкага тыпу». Аднак з-за адсутнасці сродкаў і навукова-педагагічных кадраў гэтая задума не была рэалізавана [27, л. *1*].

Летам 1920 г. пасля вызвалення Мінска камісія зноў ініцыіравала крокі да ўзнаўлення работы па адкрыццю універсітэта, бо рэальныя магчымасці стварэння універсітэта знаходзіліся ў Маскве. Зноў быў запрошаны і атрыманы дазвол Наркамасветы РСФСР на працяг падрыхтоўчых мерапрыемстваў. Характэрна, што ў час камандзіроўкі ў жніўні 1920 г. у Маскву дэлегацыя мінскай універсітэцкай камісіі (Я. Карскі і інш), якая дзейнічала пры Мінскім аддзеле народнай асветы, прасіла не

столькі фінансава-матэрыяльнай дапамогі, колькі «декретирования открытия» БДУ. На гэтую просьбу загадчык аддзела вышэйшых школ РСФСР В. Тэр-Аганесаў зусім канкрэтна даў адказ: «вопрос о декрете, ввиду объявления независимости Белоруссии и сохранения фактической связи ее с Россией, может быть решен...». А намеснік наркама асветы М. Пакроўскі дадаў, што Масква згодна з ідэяй адкрыцця універсітэта ў Мінску, але павінны быць прадэманстраваны магчымасці «местных сил». Беларуская дэлегацыя вярнулася ў Мінск задаволеная тым, што змагла высветліць «юридическое положение вопроса о декретировании открытия университета в Минске» [15, л. *102*]. Між тым прыезд дэлегацыі з Мінска падштурхнуў Наркамасветы РСФСР паскорыць узнаўленне дзейнасці маскоўскай камісіі па стварэнню БДУ. На пасяджэнні навуковага сакратарыята Наркамасветы 18 жніўня 1920 г. быў зацверджаны яе першапачатковы склад, было вырашана надаць права кааптацыі новых членаў у сувязі з узнікаючай неабходнасцю. У камісію ўвайшлі Пічэта, Турук, Карскі, Тэр-Аганесаў, Мінор, Шымановіч [30, *11*; 27, а. *23—24*].

Пад час некалькіх наступных «маскоўскіх камандзіровак» члены мінскай камісіі абмеркавалі шэраг практычных пытанняў па арганізацыі універсітэта. Адным з найбольш важных сумесных рашэнняў было прыняцце пастановы ад 7 сакавіка 1921 г. аб Часовым праўленні БДУ. Правы яго надаваліся маскоўскай «тройцы», якая фактычна ўвасабляла сваёй дзейнасцю вышэй адзначаную маскоўскую камісію. Часовае праўленне БДУ распачало свае дзеянні ў Маскве 16 сакавіка 1921 г. у складзе Уладзіміра Іванавіча Пічэты, Фёдара Фёдаравіча Турука і Захара Рыгоравіча Грынберга [28, а. *114*; 29, а. *9, 15*].

У студзені 1921 г. у Мінску адбыўся губернскі з'езд работнікаў асветы і сацыялістычнай культуры, на якім прысутнічалі дэлегаты ад усіх уездаў Беларусі. З'езд звярнуўся да Наркамасветы рэспублікі з прапановай лічыць галоўнай задачай бягучага моманту «стварэнне Беларускага дзяржаўнага універсітэта...», які адчыніць доступ да ведаў «усялякаму пісьменнаму рабочаму і селяніну Беларусі» [16, *93*]. ЦВК ССРБ прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску універсітэта ў складзе 5 факультэтаў (медыцынскага, грамадскіх навук, сельскагаспадарчага, фізіка-матэматычнага і рабочага) [27, а. *58*]. На гэтым пасяджэнні прысутнічалі члены мінскай камісіі па арганізацыі БДУ, Часовага праўлення БДУ і асобнай камісіі ў складзе найбольш аўтарытэтных прафесараў. Улічваючы нізкі адукацыйны ўзровень тых, хто мог прэтэндаваць на паступленне ў першы беларускі універсітэт, была звернута асаблівая ўвага на неабходнасць хутчэйшага стварэння так званага рабочага факультэта, праз які б можна было падрыхтаваць рабоча-сялянскую моладзь да вучобы па універсітэцкіх спецыяльнасцях. Такім чынам, БДУ адразу браў на сябе абавязак высокага сацыяльна-культурнага, а не толькі адукацыйнага і навуковага кшталту. Аб важнасці гэтай місіі гаворыць той факт, што ў спецыяльную камісію па стварэнню рабфака ўвайшлі прадстаўнікі цэнтральных органаў партыі і ўрада (В. Кнорын, Я. Каранеўскі і інш.) [17, а. *2*].

Рэальная дапамога зыходзіла ад тагачасных расійскіх вучоных з сусветным імем — К. Ціміразева, Дз. Пранішнікава, А. Фартунатава і інш. [30, *9, 10*]. Напрыканцы 1920 г. 12 вучоных з Масквы прыехалі ў Мінск, каб на месцы завяршыць падрыхтоўчыя работы і забяспечыць адкрыццё універсітэта вясной 1921 г. У складзе гэтай групы былі прафесары: гісторык У. Пічэта, хімік Б. Беркенгейм, заолаг Н. Кулагін, этнограф М. Янчук, медыкі Л. Мінор, М. Кроль і інш. Яны прыехалі ў горад, які ўразіў сваім спусташэннем, бо, як потым адзначыў першы дэкан медфака БДУ

М. Кроль, гэта была «многапацярпеўшая пагранічная паласа, якая служыла арэнай непасрэдных ваенных дзеянняў» [18, *47*].

Для аператыўнага прыняцця рашэнняў па арганізацыйных пытаннях Народны камісарыят асветы дзейнічаў праз спецыяльна створаныя «надзвычайныя ўдарныя тройкі», а потым «пяцёркі», якія не вельмі кіраваліся законнасцю, але сваім напорам добра дапаўнялі работу ініцыятыўных груп прафесараў. У такой звязцы паўнамоцных савецкіх чыноўнікаў і элітарнай, высокаадукаванай інтэлігенцыі старога гарту лягчэй было пераадольваць шматлікія бар'еры эканамічнага, нацыянальнага, псіхалагічнага, культурнага характару. Найбольш канкрэтнай стала падрыхтоўка да адкрыцця універсітэта пасля зацвярджэння Часовага праўлення БДУ. Шэраг чыста арганізацыйных праблем у гэты веснавы час 1921 г. дапаўняўся задачай асэнсавання ідэі універсітэта ўвогуле. Разгарнуліся дыскусіі наконт таго, якое месца павінны заняць савецкія універсітэты ў сістэме вышэйшай адукацыі. Было меркаванне, што ў іх складзе павінны быць факультэты толькі прыкладнога характару (медыцынскі, аграномічны і г. д.), тым часам як усё, што звязана з дзейнасцю школы, універсітэт зможа забяспечыць праз агульны педагагічны факультэт [16, *113*]. Урэшце было вырашана з-за недахопу сродкаў і абмежаваных агульных магчымасцей адкрыць універсітэт у складзе медыцынскага, грамадскіх навук і рабочага факультэтаў [19, *7*].

Рэальнасць падрыхтоўчых дзеянняў праявілася толькі пасля спецыяльнай пастановы III-й сесіі ЦВК ССРБ ад 17 красавіка 1921 г., у якой на дзяржаўным узроўні была зафіксавана неабходнасць адкрыцця ў Мінску універсітэта [20, *200*; 28, а. *7*]. Пры ЦВК была створана «універсітэцкая камісія», якая разам з Часовым праўленнем БДУ занялася канкрэтызацыяй усіх папярэдніх напрацовак і іх рэалізацыяй. Калегія Наркамасветы Беларусі 8 ліпеня прызначыла праўленне БДУ, якое ў якасці рэктара ўзначаліў Уладзімір Іванавіч Пічэта [29, л. *2*]. Разам з ім у складзе праўлення павялі справу універсітэцкай адукацыі У. Ігнатоўскі, Ф. Турук, М. Фрумкіна. Цікава, што разам з гэтымі паважанымі і высокаадукаванымі людзьмі стаў кіраўніком БДУ і студэнт — прадстаўнік рабочага факультэта Гіндзін [29, а. *3*]. Аўтарытэт У. Пічэты як вучонага і як арганізатара быў бясспрэчным. Аб гэтым сведчыць той факт, што шмат выданняў 1910-х гг., прысвечаных знамянальным падзеям у гісторыі Расіі, рыхтаваліся пры яго непасрэдным удзеле. А некаторыя ён і рэдагаваў. Так, юбілейнае выданне да 100-годдзя Айчыннай вайны 1812 г. выйшла і пад яго рэдакцыяй, і за яго аўтарствам [23]. Над гэтым фундаментальным шматтомнікам Уладзімір Іванавіч працаваў разам больш чым з 60 вельмі вядомымі расійскімі вучонымі-гуманітарыямі, сярод якіх, што цікава, было шмат тых, з кім ён будзе рыхтаваць адкрыццё БДУ, каго потым ён як рэктар запросіць на сталую работу ў Мінск: прафесары В. Волгін, Д. Жарынаў, І. Замоцін, С. Лазінскі, У. Перцаў, М. Доўнар-Запольскі і інш.

Універсітэт ствараўся як беларускі універсітэт. І хоць самыя высокія інстанцыі зыходзілі з устаноўкі, што галоўнай задачай у гэтай справе з'яўляецца неабходнасць падняць узровень «экономической культуры и производительности труда» рабочых і сялян, садзейнічаць іх «сближению во всех областях с Россией» [28, а. *36*], тым не менш ужо тое, што каля вытокаў універсітэта сталі такія выдатныя дзеячы беларускай культуры і навукі, носьбіты беларускіх адраджэнскіх ідэй, як Я. Карскі, Ф. Турук, М. Янчук, У. Ігнатоўскі, А. Савіч і многія іншыя, рабіла універсітэт фарпостам аднаўлення на беларускай зямлі ўсіх галоўных нацыянальных сфер і асяродкаў.

Апошнія кастрычніцкія дні 1921 г. сталі знамянальнымі ў жыцці і гісторыі ўсяго беларускага народа. Над Беларуссю зноў распасцёрліся крылы адукацыі і навукі вы-

шэйшага кшталту. У культуру, ва ўсе вобласці грамадскага жыцця, у палітычнае асяроддзе пачалі прыходзіць новыя людзі, адзначаныя адметнай і шматзнакавай рысай выхаванцаў універсітэта! І якія б ідэалагічныя і абывацельскія хмары не спрабавалі зацьміць, спрасціць і зганьбіць сэнс і прызначэнне універсітэта Беларусі, ён толькі мацнеў, нарошчваў свой патэнцыял, прабіваў шляхі да таямнічага святла пазнання!

У халодных, непрыстасаваных пакоях «Дамоў БДУ» павялі заняткі са студэнтамі выкладчыкі самай рознай кваліфікацыі, поглядаў, намераў на будучыню У архіве БДУ ёсць вопіс спраў пад назвай «Личные дела профессуры», складзены ў 1938 г., ён утрымлівае пад 1921 г. прозвішчы 50 выкладчыкаў, прынятых на пасады прафесараў. Дарэчы, гэтыя ж вопісы на 7 старонках нагадваюць прозвішчы 368 студэнтаў першага года паступлення [21, а. *72—73, 90—96*]. Адзначым, што некаторыя выкладчыкі па сваёй падрыхтоўцы не адпавядалі гэтаму высокаму званню, але час і абставіны вымушалі праўленне універсітэта на чале з яго першым рэктарам Уладзімірам Іванавічам Пічэтай карыстацца паслугамі такіх «варагаў». Не дзіўна, што для многіх з іх выпрабаванне Мінскам завяршалася праз месяц-другі… Але сапраўдных знаўцаў навук, тых, праз каго толькі і магло загарэцца святло ведаў універсітэцкага ўзроўню на Беларусі, утрымлівалі ўсялякімі сродкамі: выдзялялі кватэры, давалі магчымасць ездзіць у замежныя навуковыя камандзіроўкі, праяўляць свабоду навуковай і педагагічнай творчасці (на жаль, апошняе тычылася толькі перыяду 1920-х гг.).

Напрыканцы неабходна нагадаць аб тым, хто першым увайшоў у студэнцкую аўдыторыю і тым самым распачаў на Беларусі універсітэцкую адукацыю. Па волі лёсу, як ужо было адзначана раней, першая лекцыя для студэнтаў Белдзяржуніверсітэта прагучала 31 кастрычніка 1921 г. — «Аб культуры Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма». Прачытаў яе прафесар Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі. Гэты ўжо сталы чалавек, адметны сваёй постаццю, чорнай барадой, падобнай на асірыйскі клінок, у 12 гадзін дня стаў за кафедру ў вялізнай нязручнай актавай зале (якая пераўтварылася ў «Аўдыторыю № 1 БДУ») былой гімназіі Хайкіна, і студэнты факультэта грамадскіх навук першымі на Беларусі ў XX ст. былі накіраваны да вяршынь адукацыі і вучонасці [31, *53—54*].

Кім жа быў гэты чалавек — першы лектар БДУ? Дакументы пра яго захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь [22]. Нарадзіўся Дзмітрый Пятровіч 15 сакавіка 1873 г. у сяле Светавы Лучы Купянскага павета Харкаўскай губерні. Скончыў у 1903 г. гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, пасля чаго быў пакінуты знакамітым расійскім гісторыкам-антыказнаўцам прафесарам Р. Віперам пры кафедры агульнай гісторыі. У 1904–1906 гг. у якасці студэнта Берлінскага універсітэта слухаў лекцыі па рымскай гісторыі, гісторыі Грэцыі, сацыялогіі, этналогіі, эпіграфіцы, гісторыі хрысціянства. А чыталі гэтыя курсы такія аўтарытэтныя ў Еўропе вучоныя, як Б. Мегер, Г. Зіммель, О. Хіршфелель і інш. [22, а. *3*].

Пасля вяртання ў Маскву ўвосень 1906 г., Дз. Канчалоўскі быў запрошаны на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта весці практычныя заняткі са студэнтамі малодшых курсаў па агульнай гісторыі, а ўвосень 1907 г. пачаў выкладанне рымскай гісторыі на Маскоўскіх вышэйшых жаночых курсах. Увесну 1911 г. Дз. Канчалоўскі здаў магістэрскія іспыты па агульнай гісторыі ў Маскоўскім універсітэце і тады ж вымушаны быў пакінуць выкладанне ва універсітэце ў сувязі з адстаўкай рэктара Мануілава і групы прафесараў. Гэты дэмарш групы вядомых вучоных Маскоўскага універсітэта, да якога далучыўся і Дз. Канчалоўскі, меў палітычную афарбоўку. Аднак ад сваёй любімай гісторыі Дзмітрый Пятровіч не ад-

мовіўся: на вышэйшых жаночых курсах ён працягваў выкладаць да лістапада 1919 г. Потым з-за аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Масквы ён быў пераведзены ў якасці прафесара агульнай гісторыі так званага I-га Маскоўскага універсітэта..

Дзмітрый Пятровіч быў чалавекам шырокай эрудыцыі, валодаў нямецкай, французскай, англійскай і італьянскай мовамі. Да пачатку працы ў Белдзяржуніверсітэце ён паспеў выдаць некалькі навуковых прац па агульнай гісторыі – як уласных, так і перакладных (з яго навуковымі прадмовамі і каментарыямі).

У 1921 г. Дз. Канчалоўскі лічыцца ўжо прафесарам БДУ, а з ліпеня таго ж года ён знаходзіўся яшчэ і на дадатковай пасадзе прафесара Смаленскага інстытута народнай адукацыі. Прафесарам на кафедры агульнай гісторыі факультэта грамадскіх навук БДУ Дзмітрый Пятровіч працаваў з 9 верасня 1921 г. па 1 верасня 1923 г. [22, а. *7, 11*].

Калі ўважліва прааналізаваць невялічкую «асабістую справу» прафесара, у якой усяго некалькі старонак, то можна зрабіць выснову, што Дз. Канчалоўскі быў персанальна запрошаны ў БДУ рэктарам У. Пічэтай. Напэўна, паміж імі існавалі сяброўскія адносіны яшчэ з часоў сумеснай працы ў Маскоўскім універсітэце. Гэтае меркаванне пацвярджаецца і тым, што ў 1911 г. У. Пічэта, «належачы да разраду левай прафесуры» (аб гэтым ён сам напісаў у сваёй аўтабіяграфіі), разам з Дз. Канчалоўскім пакінуў Маскоўскі універсітэт. Рэктар не цураўся асабіста адвезці жалаванне Дзмітрыя Пятровіча ў Маскву, калі той не змог сам прыехаць за ім у Мінск. Цікава, што ў чэрвені 1922 г. У. Пічэта адвёз і грошы ( 30 мільёнаў тагачасных рублёў), якія выдзеліў БДУ Дзмітрыю Пятровічу, каб той змог купіць білет на цягнік, прыехаць да студэнтаў БДУ і прыняць у іх залік. Такія пераезды былі звязаны і з бюракратычнай цяганінай, цяжкасцямі, абумоўленымі нядаўнімі рэвалюцыйнымі і ваеннымі падзеямі. Напрыклад, каб прыехаць у Мінск з Масквы, патрэбны быў спецыяльны пропуск, дзеля чаго праўленне БДУ прадстаўляла працоўную кніжку прафесара ў «Цэнтральны аддзел прапускоў» для атрымання дазволу [22, а. *8*].

І яшчэ адна заўвага. На жаль, жыццёвы шлях першага лектара БДУ вельмі цяжка прасачыць, бо інфармацыі аб гэтым гісторыку ў адпаведных выданнях і архівах не вельмі шмат. Так, нельга пакуль дакладна гаварыць аб тым, які ўзровень навуковай кваліфікацыі меў Дз. Канчалоўскі на час яго запрашэння ў БДУ. Калі мець на ўвазе пералік яго прац, якія ён сваёй рукой упісаў у аўтабіяграфію, то яны не дастаткова ўнушальныя як па колькасці, так і па навуковым характарыстыкам. Найбольш грунтоўным у навуковым сэнсе ўспрымаецца даследванне «Аграрное движение в Риме и реформы братьев Гракхов», якое гісторык падрыхтаваў да друку якраз у час сваёй працы ў БДУ. Верагодна, пасада прафесара БДУ, на якую быў уладкаваны Дзмітрый Пятровіч, не была падмацавана адпаведнага ўзроўню навуковай дысертацыяй. Але такое становішча з кадрамі было тады звычайным і пасады прафесароў займалі часцей выкладчыкі без доктарскіх ступеняў, чым з імі. Недарэчным было і тое, што шмат універсітэцкіх выкладчыкаў вялі заняткі са студэнтамі літаральна «з колаў», бо прыязджалі ў БДУ з Масквы і іншых расійскіх гарадоў на некалькі дзён, каб пасля хуткай «вычыткі» вучэбных курсаў зноў вярнуцца да сваіх сем'яў. Таму вучэбны працэс у БДУ амаль на працягу ўсіх 1920—30 гг. залежаў ад выкладчыкаў, працаваўшых «наездамі», ад таго, які́м часам і якімі магчымасцямі тыя валодалі. Так працаваў у БДУ і Дз. Канчалоўскі: ён стала жыў у Маскве ў доме № 22 па Мёртваму завулку. Дарэчы, сем'я рэктара У. Пічэты таксама знаходзілася ў Маскве, што вымушала (ці дазваляла?) яго часта наведвацца ў сталіцу СССР.

Так ці інакш, але менавіта Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі сваей лектарскай працай як бы адчыніў дзверы для першых студэнтаў аднаўленага беларускага універсітэта ў свет ведаў, у XX стагоддзе. І тым самым назаўседы ўвайшоў у гісторыю БДУ, больш за тое — у гісторыю беларускага асветніцтва, культуры. Бо менавіта з Беларускага універсітэта і дзякуючы яму на Беларусь вярнулася нацыянальная адукацыйная прастора, якая стварыла магчымасці для развіцця навукі, новага ўзроўню грамадскіх сувязей, агульнай культуры, цывілізаванасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Ле Гофф Ж.* Другое Средневековье: Время, труд и культура Запада. Екатеринбург, 2000.
2. Документы по истории университетов Европы XIV—XV вв. Воронеж, 1973.
3. Устав Белорусского государственного университета. Мн., 1999.
4. Полное собрание законов Российской империи. 2-е собр. Т. 44. Отд. 1. Спб., 1870.
5. *Самусік А. Ф.* Развіцце сістэмы асветы на беларускіх землях у апошняй трэці XVII— першай трэці XIX стагоддзя. Дыс. канд. гіст. навук. Мн., 1998.
6. *Пічэта У. І.* Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым // Працы БДУ ў Менску. 1928. № 19.
7. *Иванов А. Е.* География российских университетов: реальность и планы (конец XIX — начало XX века) // Российские университеты в XVIII—XX века. Сборник научных статей. Вып. 5. Изд-во Воронежского государственного университета. 2000.
8. Витебские губернские ведомости. 1903. 28 сентября.
9. *Кіпель Я.* Эпізоды / Пад рэд. І. Урбановіч і З. Саўкі. Нью Йорк, 1998.
10. Архіў музея гісторыі БДУ.
11. Известия ЦИК Советов Белоруссии. 1919. 6 марта.
12. Звезда. 1919. 23 марта.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 24, воп. 2, спр. 1628.
14. НГАБ, ф. 24. воп. 2, спр. 1628.
15. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 205, воп. 1, спр. 121.
16. Школа и культура Советской Белоруссии. 1921. № 1—2.
17. НАРБ, ф. 206, воп. 2, спр. 9.
18. *Кроль М. Б.* Першыя крокі па арганізацыі медфаку БДзУ (Успаміны) // Беларускі дзяржаўны універсітэт да 10-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менск, 1927.
19. *Пічэта У. І.* Беларускі Дзяржаўны Універсітэт напярэдадні 10-годдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі // Беларускі Дзяржаўны Універсітэт да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск, 1927.
20. *Турук Ф.* Университетская летопись // Труды Белорусского государственного университета. 1922. № 1.
21. Архіў Белдзяржуніверсітэта. «Описи дел Белгосуниверситета за период с 1921—1932 годы».
22. НАРБ, ф. 205, воп. 3, спр. 3941.
23. Отечественная война и русское общество. 1812—1912. М., 1912.
24. Школа и культура Советской Белоруссии. Апрель 1919. № 1.
25. Памятная книжка Виленского учебного округа за 1911—1912 учебный год. Вильно, 1912.
26. НГАБ, ф. 467, воп. 1, спр. 1.
27. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 1.
28. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 2.
29. НАРБ, ф. 205, воп. 1, спр. 6.
30. *Кожушков А. И., Яновский О. А.* Белорусский университет: хроника событий (1919— 1989). Мн., 1990.
31. *Вальфсон С. Я.* Адрыўкі з успамінаў і думкі // Беларускі Дзяржаўны універсітэт да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск, 1927.